**Ой, зіма, ты — чараўніца,**
**Колькі радасці нясеш!**
*Яніна Жабко.*

# КОЛЕРЫ ГОДА. ЗІМА



У снежні сняжынкі
занеслі сцяжынкі.

Ходзіць студзень,
Студзіць студзень,
Цэлы месяц холад будзе.
*Авяр'ян Дзеружынскі.*

Надзьмуты люты дзьме.
Ну, дзе канец зіме?
*Васіль Жуковіч.*

Правообладатель Национальный институт образования

## КРУЖАЦЦА, КРУЖАЦЦА ЗОРКІ-СНЯЖЫНКІ І ЗІХАЦЯЦЬ ТАЯМНІЧЫМ СВЯТЛОМ...
*(Яніна Жабко)*

Успомніце, якія пачуцці (радасць, здзіўленне, пяшчота) узнікаюць у вас, калі любуецеся першым снегам.

Угары́ — уверсе; *рус.*: вверху.

Разгледзьце малюнак. Прачытайце назву верша. Уявіце, якая размова магла адбыцца паміж сняжынкамі.

### Размова сняжынак

*Ніна Галіноўская*



Мы — вясёлыя пушынкі,
І сябруем мы з зімой,
Мы — сняжынкі-балерынкі,
Мы танцуем танец свой.



Правообладатель Национальный институт образования



Ах, як хочацца нам болей
Пакружыцца над зямлёй!
Апускаемся паволі
І гамонім між сабой:
— Я саджуся на галінку.
— Я — на плот.
— А я — на дах.
— Апушчуся на сцяжынку.
— Сяду я на правадах.
Мы — вясёлыя пушынкі,
Мы танцуем угары,
Мы — сняжынкі-балерынкі.
Танец наш — для вас, сябры!

1. Прачытайце, што паведамілі пра сябе сняжынкі. Пры чытанні голасам выдзяляйце словы кожнай сняжынкі.
2. Для каго паказваюць свой танец сняжынкі?
3. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб паказаць танец сняжынак?
4. Навучыцеся чытаць верш выразна.

Якi зiмовы пейзаж вы ўявiлi? Апiшыце яго словамi. Па жаданнi стварыце малюнкi.

Правообладатель Национальный институт образования

Прачытайце прыказку. Якую карысць нясе снег?

- Многа снегу — многа хлеба.

Гары́шча — памяшканне паміж столлю і дахам на хаце; *рус.*: чердак.

Прачытайце твор і скажыце, чаму аўтар называе снег цёплай коўдрай.

## Снег

*Васіль Хомчанка*

Зямля доўга ляжала голая, скамяне́лая ад марозу. А потым адной ноччу пайшоў снег і ўкрыў усё белай цёплай коўдрай.




Правообладатель Национальный институт образования

Ромка дастаў з гарышча лыжы і памчаўся ў поле. Раздолле для хлопца!

Ромкаў бацька таксама радуецца. Маладыя яблынькі ў садзе цяпер не за-ме́рзнуць. Карані́ іх добра ўкрыты снегам.

І мядзведзю ў бярлозе цяплей стала. Вожыку — у кучы лісця, мышцы — у нары.

Усім цёпла, усе радуюцца.

Толькі беднаму зайку слёзы. Да зімы не паспеў шэрую поўсць змяніць на белую.

1. Знайдзіце ў творы і прачытайце, каго парадаваў першы снег.
2. Якія «добрыя справы» робіць снег?
3. Як вы разумееце выраз «толькі беднаму зайку слёзы»?
4. Падрыхтуйце пераказ твора.



Прачытайце народныя прыкметы пра зіму. Station: Паназірайце за зімовымі з’явамі ў прыродзе.

- Калі мала снегу на галінках дрэў, то летам ні грыбоў, ні ягад не знойдзеш.
- На дубе многа жалудоў — будзе марозная зіма.

Правообладатель Национальный институт образования